# ДАЙ ХВАРОБЕ ВОЛЮ – ЗАМОРЫЦЬ

**У Нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь адбылася прэс-канферэнцыя на тэму «Эпідэміялагічная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь. Прафілактыка вострых рэспіраторных захворванняў, грыпу і іншых захворванняў, характэрных у зімовы перыяд».**

Для цяперашняга перыяду года асабліва характэрныя вострыя рэспіраторныя захворванні, у тым ліку грып, усе астатнія інфекцыі адыходзяць на другі план, адзначыла актуальнасць тэматыкі прэс-канферэнцы намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь І. А. Карабан. Спецыяліст спынілася на выніках кампаніі па імунізацыі насельніцтва супраць грыпу ў сезоне 2017/2018. Вакцынацыю прайшло 40,5 % насельніцтва Беларусі. Было прышчэплена 3 млн 773 тыс. 785 чалавек. Вакцынацыя, як і раней, праходзіла за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэту, за кошт прадпрыемстваў, а таксама асабістых сродкаў грамадзян. Сярод прадстаўнікоў груп павышанай рызыкі ахоп прафілактычнымі прышчэпкамі склаў 75,3 % пры рэкамендуемых паказчыках СААЗ ў 75 %, у тым ліку медыцынскія работнікі ахоплены на 84,3 %, асобы з устаноў з кругласутачным знаходжаннем дзяцей і дарослых – 82,9 %, работнікі служб забеспячэння жыццядзейнасці і бяспекі дзяржавы – на 78,5 %, астатнія катэгорыі ахоплены на 50 % і вышэй (рэгламентаваны паказальнік СААЗ – не менш за 40 %). Прышчэплена ад грыпу 51,3 % дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў, якія наведваюць дзіцячыя арганізаваныя калектывы, амаль 54 % школьнікаў, 61,5 % навучэнцаў прафесійна-тэхнічных устаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, а таксама амаль 58 % работнікаў устаноў адукацыі.

Іна Аляксандраўна закранула пытанне эфектыўнасці мінулагодняй вакцынацыі супраць грыпу. Паводле слоў спецыяліста, з дапамогай вакцынацыі было папярэджана больш за 145 тыс. выпадкаў захворвання на грып, у тым ліку як мінімум 17 тыс. шпіталізацый. Дадаткова было папярэджана не менш за 400 тыс. зваротаў насельніцтва за амбулаторна-паліклінічнай дапамогай, а таксама каля 200 тыс. вострых рэспіраторных захворванняў негрыпознай этыялогіі. Гэта ўсё дае падставы гаварыць пра высокую эканамічную эфектыўнасць праводзімых мерапрыемстваў. Штогод памяншаецца колькасць вострых выпадкаў захворвання на грып, не рэгіструюцца эпідэміі, насельніцтва стала больш адукаваным у гэтым пытанні.

Кіраўнік Нацыянальнанга цэнтра па грыпе Н. В. Грыбкова падрабязна спынілася на пытанні, што такое грып. У групе рэспіраторных захворванняў прысутнічае мноства розных вірусаў, сярод якіх вірусы грыпу самыя небяспечныя. З 70-х гадоў мінулага стагоддзя вірусы грыпу цыркулююць адначасова, эвалюцыянуюць і мяняюцца ў працэсе развіцця чалавечай папуляцыі. Спецыяліст сцісла спынілася на карціне па грыпе, якая сёння назіраецца ў Еўропе: у гэтым сезоне узровень захворвання на грып не такі высокі і колькасць вірусаў, якія рэгіструюцца нацыянальнымі цэнтрамі па грыпе ў розных краінах, невялікая. Аналіз паказвае, што па этыялогіі захворванні выклікаюць тыя самыя вірусы грыпу А і вірусы грыпу В. Але ў наш час няма аднастайнасці, калі пануе нейкі адзін падтып віруса. Цыркулюе адначасова

некалькі варыянтаў віруса, і на працягу сезона па грыпе чалавек можа захварэць некалькі разоў. Таму зараз прафілактыка набывае асобае значэнне, бо толькі вакцына можа знізіць цяжар захворвання і колькасць ускладненняў. Спецыяліст засяродзіла ўвагу на тым, што пры ўзнікненні першых сімптомаў захворвання на грып трэба не займацца самалячэннем, а адразу ж звярнуцца да ўрача і вытрымліваць пасцельны рэжым.

Галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь па інфекцыйных хваробах І. А. Карпаў засяродзіў увагу прысутных на ўскладненнях грыпу, асабліва для груп рызыкі. Гэта дзеці, асобы старэйшыя за 65 год; людзі, якія маюць хранічныя захворванні (ішэмічную хваробу сэрца, склероз сасудаў, бранхіяльную астму, цукровы дыябет), а таксама цяжарныя жанчыны, якія, на думку спецыяліста, абавязкова павінны атрымаць этыятропную тэрапію. Вакцынаваная жанчына закрывае свой імунітэт і імунітэт народжанага дзіцяці на паўгода. Н. В. Грыбкова дадала, што пытанне прафілактыкі цяжарных абвастраецца ў сувязі з тым, што вірус грыпу можа перадацца ад маці да плоду, таму можа адбыцца затрымка развіцця, што выклікае рызыку страты плоду.

Прысутных цікавіла пытанне, што рабіць цяпер, калі перыяд вакцынацыі прайшоў. Як засцерагчыся, замацавацца? Ці прымаць нейкія імунамадулятары, вітаміны? На гэта пытанне спецыялісты ў адзін голас адказалі, што першы і адзіны сродак замацавання імунітэту – вакцынацыя. Калі ж нехта па якойсці прычыне прапусціў зручны момант, тады трэба звярнуць увагу на ўмераную фізічную нагрузку, дыетычную ежу і вітаміны. Варта таксама памятаць аб частым мыцці рук з мылам і змазванні і спрыскванні носа фізрастворам (вірус трапляе і замацоўваецца толькі ў сухім асяроддзі). Эфектыўнасць жа імунамадулятараў мае вельмі нізкі доказны ўзровень, таму не варта даваць арганізму дадатковую лекавую нагрузку.

***Падрыхтавала:***
**І. І. БАНДУРЫНА,**
*вядучы рэдактар-стыліст*